
Відзначення
200-річчя від дня
народження Т. Шевченка

# Тарас Шаўчэнка (1814 – 1861)



# Дзяцінства і служба ў пана



Пан Энгельгарт

9 сакавіка 1814 г. – нарадзіўся ў сяле Морынцы на Чаркашчыне ў сям'і прыгонных сялян. Бацька – *чумак*. Продкі – вольныя казакі.

Вучыцца ў сельскага дзяка чытанню, пісьму і маляванню.

1823 г. – смерць маці. 1825 г. – смерць бацькі.

1828 г. – служыць *казачком* у пана Энгельгарта.



# «Якбы вы зналі, панічы…»

Якбы вы зналі, панічы,
Дзе людзі плачуць жывучы,
Дык вы б элегій не стваралі
Багоў дарма не выхвалялі,
На нашы слёзы плюючы.
За што, не знаю, называюць
Хаціну ў гаю ціхім раем.
Я ў хаце мучыўся калісь,
У першы раз даўвно цяклі,
Мае там слёзы! Я не знаю,
Ці ёсць такое ў Бога зло,
Што ў той хаціне не жыло?
А хату раем называюць!
Не называю яе раем,
Тую хацiначку у гаю
Над чыстым ставам край сяла.
Мяне там маці спавіла
І, спавіваючы, спявала,
Сваю нуду пералівала
Сваёй дзяціне… У гаю,
У той хаціне, у раю,
Я бачыў пекла… Там няволя,
Работа цяжкая, ніколі
І памаліцца не даюць.





# Выкуп з прыгону



Партрэт В. Жукоўскага работы К. Брулова

**1829г.** – падарожжа разам з панам у Вільню, <u>праязджае праз Беларусь</u> («*краіна наракання і плачу*»), знаёмства з польскай літ.

Пан, заўважыўшы здольнасці Тараса, аддае яго вучыцца на мастацкія курсы Шыраева ў Пецярбургу. Знаёмства з К. Бруловым і В.Жукоўскім.

**1838 г.** – Брулоў і Жукоўскі выкупілі Шаўчэнку з прыгону. Ён паступае ў Імператарскую акадэмію мастацтваў.





# Літаратурная творчасць

**1840 (1844, 1860) г. – зборнік «Кабзар»** (***кабзар*** **– вандроўны музыка, які грае на кобзе ⇒ Шаўчэнку празвалі Кабзаром).**




## Тэматыка:

- доля ўкраінскага народа, прыгнёт з боку РІ;
- адчужэнне ўкраінцаў ад роднага;
- заклік да нацыянальнага абуджэння ўкраінцаў;
- гістарычная і біблейская тэматыка.



# Літаратурная творчасць






1843, 1845 гг. – падарожжы па Украіне: «*усюды быў, усюды плакаў…*». Піша верш «Запавет». Ідэя: барацьба за свабоду і незалежнасць, яднанне народа, «матыў помніка».

1846г. – член Кірыла-Мяфодзіеўскага брацтва, выкрыта, Шаўчэнка арыштаваны.

1843 – 1845 гг. – перыяд «трох лет» ⇒ зборнік «Тры лета». Асн. рыса – спалучэнне рамантызму і рэалізму.

# Перыяд «Трох лет»



**1847 г. – высылка ў Арэнбург «без права пісаць і малявац».**

**1857 г. –дазволена вярнуцца ў Пецярбург.**

**1859 г. – апошняе падарожжа па Украіне.**

*«Яго ўсё цягнула ў сваю родную Украіну, дзе ён такі пабываў летам 1859, жадаючы набыць кавалачак зямелькі над Дняпром, на гары, каб там апошнія гады дажыць.»*

*П. Мірны*

*«Пасля дзесяцігадовай ссылкі Шаўчэнка нарэшце вярнуўся ў Пецярбург, зламаны целам, але не духам... Нават у тыя страшныя гады яго муза не заціхала...»*

*І. Франко*

**10 сакавіка 1861 г. – паэт памёр, пахаваны ў Пецярбургу.**

**20 мая 1861 г. – згодна з «Запаветам» перапахаваны ў Каневе на Манаскай гары.**




Магіла Т. Шаўчэнка ў Пецярбургу



Пасмяротная маска



Від з Тарасавай гары на Дняпро



Магіла паэта ў Каневе


Хата Шаўчэнка ў Каневе

# Помнік Шаўчэнку ў Кіеве







Помнік Шаўчэнку ў Мінску


Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт

# Аўтапартрэты Т. Шаўчэнка



1840 г.



1847 г.



1857 г.

# Значэнне творчасці Т. Шаўчэнка

Фарміраванне нац. ідэі ўкр. народа – незалежнасць і свабода;

Фарміраванне ўкраінскай літаратурнай мовы;

Вяршыня ўкраінскага рамантызму;

Пашырэнне фальклору і гісторыі Украіны (праз творы);

Уплыў на літ. усіх славянскіх народаў;

Новыя формы і жанры;

**ВЕЛІЗАРНЕЙШЫ ЎПЛЫЎ НА БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ 2-й паловы XIX – пач. XX СТСТ.!!!**











# Дамашняе заданне

1. Вывучыць біяграфію Тараса Шаўчэнка
2. Прачытаць п’есу «Ідылія» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча
3. Узяць у бібліятэцы «Гапон» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча